# ЗРАБІЦЬ МАГЧЫМАСЦЬ РАЗЗБРАЕННЯ РЭАЛЬНАЙ САПРАЎДНАСЦЮ

**Выступленне кіраўніка дэлегацыі Беларускай ССР К. В. КІСЯЛЕВА ў Палітычным камітэце на XX сесіі Генеральнай Асамблеі ААН па пытанню аб скліканні Сусветнай канферэнцыі па раззбраенню 19 лістапада 1965 года**

Паважаны старшыня!

Дэлегацыя Беларускай ССР хацела б выкласці сваю пазіцыю па пытанню аб скліканні Сусветнай канферэнцыі па раззбраенню.

Вядома, што ідэя склікання шырокага міжнароднага форума, на якім усе дзяржавы зямнога шара атрымалі б магчымасць абмяняцца думкамі па праблеме раззбраення і намеціць узгодненыя крокі з мэтай яе вырашэння, нарадзілася не ўчора, яна мае ўжо немалы ўзрост. Тая акалічнасць, што гэта ідэя паступова авалодала вялікай колькасцю дзяржаў і ператварылася ў рэальную матэрыяльную сілу, толькі пацвярджае неабходны характар патрабавання склікання Сусветнай канферэнцыі па раззбраенню.

Гонка ўзбраенняў, якая працягваецца па віне заходніх дзяржаў — краін НАТО, знаходзіцца ў поўнай процілегласці з надзённымі патрэбнасцямі чалавецтва. Непасільны цяжар гонкі ўзбраенняў узялі на сябе шмат якія краіны. Так, згодна з паведамленнем Асошыэйтэд Прэс з Осла ў жніўні г. г. у дакладзе, падрыхтаваным для нарады экспертаў 12-ці

прац, безумоўна, з'явілася станоўчым вынікам работы Камісіі ААН па раззбраенню.

Беларуская ССР з самага пачатку вітала ідэю склікання Сусветнай канферэнцыі па раззбраенню, як новай, спрыяльнай магчымасці ў безвыніковых пакуль спробах істотна наблізіцца да ажыццяўлення дагавору аб усеагульным і поўным раззбраенні. Як вядома, Беларуская ССР разам з іншымі міралюбівымі краінамі выказвала гатоўнасць прыняць рашэнне аб скліканні Сусветнай канферэнцыі па раззбраенню ў Камісіі ААН па раззбраенню. 21 мая 1965 года прадстаўнік Беларускай ССР адзначыў, выступаючы ў памянёнай камісіі: «Голас недалучыўшыхся краін, які прагучаў у Каіры, прапанова гэтых краін аб скліканні Сусветнай канферэнцыі па раззбраенню заслугоўвае самай шырокай падтрымкі і адабрэння. Са свайго боку, Камісія па раззбраенню павінна зыказацца за правядзенне такой канферэнцыі».

своеасаблівую хваробу, што называецца напружанасцю. Гэта хвароба старанна вывучана, і нам вядомы яе прычыны. Цяпер прапанаван сродак для таго, каб пазбавіцца ад напружанасці ў міжнародных адносінах, абмеркаваць і вызначыць шляхі ўсеагульнага і поўнага раззбраення як адзінай гарантыі ад знішчальнай вайны, гарантыі міру і бяспекі. Гэты сродак і ёсць сусветная канферэнцыя па раззбраенню з удзелам усіх краін свету.

Як мы разумеем, сутнасць прапановы аб скліканні Сусветнай канферэнцыі па раззбраенню заключаецца ў тым, каб садзейнічаць вырашэнню праблемы ўсеагульнага і поўнага раззбраення, у тым ліку праз эфектыўныя меры, якія вядуць да змяншэння напружанасці ў міжнародных адносінах, да іх аздараўлення і скарачэння гонкі ядзерных і звычайных узбраенняў.

Як вядома, у Камітэце 18-ці дзяржаў па раззбраенню пустуе месца

Такім чынам, падабаецца каму-небудзь ці не падабаецца палітычны курс або нават існаванне той ці іншай дзяржавы, неабходна згадзіцца з неабходнасцю і пажаданасцю яе ўдзелу ў сусветнай канферэнцыі; хто не робіць гэтага, той выкрывае сябе, як фактычны праціўнік раззбраення, як вораг міру і бяспекі народаў.

19 кастрычніка г. г. паважаны прадстаўнік Канады, якога пазней падтрымалі некаторыя іншыя заходнія краіны, гаварыў у нашым камітэце пра «складанасці», з якімі звязана правядзенне Сусветнай канферэнцыі па раззбраенню, упамінаючы, у прыватнасці, пытанні формы, часу і месца яе склікання, фінансавання, парадку дня і працэдуры. На нашу думку, складанасці на тое і існуюць, каб не пасаваць перад імі, а пераадольваць іх. Калі б тыя, хто палохае нас складанасцямі, не на словах, а на справе прызналі тэрміновую неабходнасць канферэнцыі, прызналі неабходнасць свайго канструктыўнага

носінамі раду заходніх дзяржаў да пытання аб скліканні Сусветнай канферэнцыі па раззбраенню. Мы не раз чулі аб тым, што яны толькі «ў прынцыпе» згодны з правядзеннем такой канферэнцыі. На практыцы яны выстаўляюць, аднак, столькі папярэдніх умоў, якія даюць поўную падставу лічыць, што гэтыя заходнія дзяржавы не хочуць пайсці насустрач агульнаму пажаданню народаў, яны імкнуцца не дапусціць склікання канферэнцыі або адцягнуць яе скліканне на неакрэслены тэрмін.

Наша дэлегацыя хацела б з усёй яснасцю заявіць таксама аб недапушчальнасці любых папярэдніх умоў, звязаных з канферэнцыяй, аб іх прынцыповай непрыймальнасці. Сапраўды, панове, Сусветная канферэнцыя — гэта форум суверэнных, раўнапраўных дзяржаў, у адносінах якіх зусім недапушчальны любы дыктат. Неабходна ўсведамляць тое, што канструктыўны характар дыскусій вызначаецца не навязваннем сум-

ферэнцыі, будзе варта павагі, мы тым самым створым найлепшыя ўмовы для раўнапраўнага абмену думкамі на канферэнцыі паміж членамі і нячленамі ААН, і гэта, безумоўна, зробіць станоўчы ўплыў на вынікі яе дзейнасці.

Усім зразумела, што адсутнасць прагрэсу ў пытаннях раззбраення тлумачыцца прынцыпова рознай пазіцыяй, з якой падыходзяць да гэтых пытанняў розныя краіны. Аднак было б няправільным рабіць з гэтага вывад, што прагрэс не магчымы наогул. Справа ў тым, што пераважная большасць дзяржаў выступае за ўсеагульнае і поўнае раззбраенне, і гэта вельмі важна. Большасці, трэба меркаваць, удаецца ўрэшце-рэшт пераадолець супраціўленне меншасці, пакуль, як відаць, яшчэ не гатовай сур'ёзна заняцца праблемай раззбраення і практыкуючай агрэсіўныя дзеянні.

Кіруючыся жаданнем максімальна аблегчыць скліканне Сусветнай канферэнцыі з удзелам усіх краін свету, а таксама забяспечыць для яе нармальныя ўмовы работы і тым самым найбольшыя шансы на плённыя

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы